# ВЕСЦІ
## НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК 2007 № 4

# ИЗВЕСТИЯ
## НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ

СЕРИЯ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК 2007 № 4

ЗАСНАВАЛЬНІК – НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Часопіс выдаецца са студзеня 1956 г.

Выходзіць чатыры разы ў год

## ЗМЕСТ

### ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ

**Чарвінскі А. С.** Філасофска-метадалагічны аналіз паняцця «якасць навакольнага асяроддзя» .................. 5
**Горыш І. У.** Праваслаўныя традыцыі ў прадпрымальніцтве Рэспублікі Беларусь ..................... 9

### ПРАВА

**Карповіч Н. А.** Прававыя асновы ўзаемадзеяння Парламента і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ................ 14
**Вярцінская А. А.** Некаторыя аспекты паняццяў «прафесійнае навучанне», «павышэнне кваліфікацыі» і «прафесійная падрыхтоўка» работнікаў ..................... 23

### ЭКАНОМІКА

**Свярлоў А. С.** Рэгіянальныя прыярытэты экспарту вырабаў электроннай тэхнікі ..................... 29
**Акуліч У. А.** Палітычная эканомія паводле ўкладу Гераніма Страйноўскага..................... 34

### ГІСТОРЫЯ

**Несцяровіч М. Б.** Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) ......... 43
**Пасталоўскі С. А.** Паўсядзённае жыццё старавераў у Беларусі ў 1920–1930-я гады ..................... 51
**Шаўчук І. І.** Станаўленне сістэмы падрыхтоўкі вучоных-гуманітарыяў у БССР (20–30-я гады XX ст.) ..................... 57

## МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

**Швед І. А.** Утылітарны і рытуальна-абрадавы аспекты выкарыстання дрэва ў традыцыйнай славянскай культуты ........ 67

**Алфёрава А. Г.** Птушка як метафарычны замяшчальнік прыродных з'яў у славянскіх загадках ........ 73

**Шамрук А. С.** Эвалюцыя канцэпцый формаўтварэння ў архітэктуры XX – пачатку XXI стагоддзя ........ 77

**Валанцэвіч Н. С.** Праблемы даследавання тэатральнай культуры Віцебскай губерні ў XIX – пачатку XX ст. .... 84

## ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

**Ткачова П. П.** Да праблемы межаў гумару і сатыры ў сістэме родаў літаратуры ........ 92

**Гаравая І. П.** Беларускі пераклад англамоўнай паэзіі XIX–пачатку XX ст ........ 96

## МОВАЗНАЎСТВА

**Марозава Л. П.** Аб суадносінах успрымаемых і акустычных прыкмет тэрмінальнага тону ў французскай мове ........ 102

**Каваленка А. М.** Онімы як аб'ект этымалогіі: цытатныя і дэскрыптыўныя назвы ........ 108

**Лукашанец А. Г.** Словаўтваральны патэнцыял суфіксаў назоўнікаў рускай мовы (на матэрыяле сучаснага крымінальнага арго) ........ 115

## ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ

**Яўген Іванавіч Скурко (Максім Танк)** (Да 95-годдзя з дня нараджэння) ........ 122

*І. У. ГОРЫШ*

# ПРАВАСЛАЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Палескі дзяржаўны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 20.03.2007)*

Працэс фарміравання і станаўлення рыначных адносін у Беларусі, пачатак якога прыходзіцца на 90-я гады XX стагоддзя, аказаў і працягвае аказваць істотны ўплыў на культуру і менталітэт беларускага народа. Прадпрымальніцтва як асаблівы элемент рыначнай эканомікі стала магчыма ў нашай краіне дзякуючы шэрагу новых сацыяльна-палітычных умоў, якія дазволілі найбольш актыўным індывідам праявіць сваю гаспадарчую ініцыятыву. Аднак нярэдка наваўвядзенні сутыкаюцца з неразуменнем і процідзеяннем. І гэта не дзіўна: кожнае грамадства будуецца на больш ці менш устойлівай сістэме нормаў, каштоўнасцей, традыцый фарміравання эканамічных адносін. Таму ў якасці першай рэакцыі яму ўласціва часцей за ўсё насцярожанае стаўленне ці нават супрацьўленне наваўвядзенням, звязаным са змяненнем эканамічнага ўкладу.

З'яўленне феномена прадпрымальніцтва патрабавала ад грамадства ўдасканалення заканадаўства і трансфармацыі свядомасці, як калектыўнай, так і індывідуальнай. Пад час рэалізацыі гэтых мэтаў была распачата спроба выкарыстаць перадавы вопыт замежных краін. Аднак трэба ўлічваць тое, што ў заходнім грамадстве дамінуюць зусім іншыя каштоўнасці, якія адрозніваюцца ад каштоўнасных арыентацый нашага народа. Гэты факт вымушае шукаць спецыфічныя шляхі развіцця беларускага прадпрымальніцтва, якія б засноўваліся на культурна-гістарычных традыцыях, рэлігійных каштоўнасцях, а таксама сацыяльна-эканамічных і палітычных умовах, характэрных для сучаснай беларускай дзяржавы.

Прадпрымальніцтва ў агульнапрынятым сэнсе зарадзілася ў нетрах капіталізму, які паводле В. Зомбарта вырас з самых глыбіняў еўрапейскай душы. «Дух, які стварае пераўтварэнне спакою (традыцыяналізм) у клопат, статычнай (феадальна-рамеснай) гаспадаркі ў дынамічную, ёсць дух капіталістычны» [1, с. 48].

На думку М. Вебера, істотную ролю сацыяльных механізмаў рэгулявання развіцця эканамічнага жыцця выконваюць этычныя і рэлігійныя інстытуты. Яны прызначаны фарміраваць неабходныя духоўныя якасці, спецыфічныя рысы характару, якія дазволяць не баяцца наваўвядзенняў і будуць садзейнічаць грамадскаму развіццю [2]. Легітымуючым пачаткам капіталістычных адносін у перыяд іх зараджэння выступіла заходняя пратэстанцкая этыка, якая адыграла важную ролю ў фарміраванні і станаўленні новага «капіталістычнага духу».

Ёсць меркаванні, што прадпрымальніцтва ў Беларусі магчыма абгрунтоўваць, выкарыстоўваючы этычныя прынцыпы пратэстантызму, паколькі каталіцызм, а тым больш праваслаўе крайне негатыўна адносяцца да новага віду гаспадарчай дзейнасці. На думку Е. С. Троіцкага, праваслаўю ўласціва адхіленне бізнесу як формы дзейнасці, і «Руская Праваслаўная Царква (і культура, якая ёю параждаецца) як дакладная версія хрысціянства супрацьстаіць буржуазным каштоўнасцям» [3].

Аднак у сучасным сацыяльна-філасофскім дыскурсе існуюць і іншыя пункты гледжання, якія акцэнтуюць увагу на магчымасці імплантацыі культурна-гістарычных і рэлігійных асабліваццей народа для ўкаранення феномена прадпрымальніцтва ў масавай свядомасці. У канцы XIX – пачатку XX ст. Расія была адной з краін, якія найбольш хутка развіваліся, і немалаважная

заслуга ў гэтым належала прадпрымальніцтву, якое засноўвалася не на пратэстанцкай этыцы, а на духоўна-маральных асновах праваслаўя. Сучасны эканаміст і гісторык расійскага прадпрымальніцтва А. Платонаў лічыць, што менавіта асаблівасці праваслаўнага менталітэту абумовілі прыхільнасць прадстаўнікоў тагачаснай бізнес-супольнасці да шырокай дабрачыннасці, прыўнеслі ў дзелавую сферу прадстаўленне аб адносным значэнні зямнога багацця перад вечнымі духоўнымі каштоўнасцямі [4, с. 25–29].

Для таго каб праінтэрпрэтаваць феномен прадпрымальніцтва з пункту гледжання праваслаўя, варта разгледзець такія паняцці, як праца, уласнасць і багацце з пазіцыі праваслаўнага светаўспрымання і светаразумення.

Праца і багацце як феномены існасці чалавека непарыўна звязаны з уласнасцю як гістарычна вызначаным спосабам прысваення людзьмі прадметаў вытворчага і невытворчага (асабістага) спажывання. Уласнасць звязана з рэччу (матэрыяльнай або ідэальнай) прадметам спажывання, але адначасова яна прадстаўляе сабой і адносіны паміж людзьмі з нагоды рэчы. Уласнасць выступае як прыналежнасць сродкаў і прадуктаў вытворчасці пэўным асобам – індывідам або калектывам. Правы ўласнасці як правы пэўных суб'ектаў на пэўныя прадметы (матэрыяльныя або ідэальныя) зводзіцца да трох правамоцтваў: права ўладання, права карыстання і права распараджэння.

Адносіны да працы, багацця, уласнасці ў розныя гістарычныя эпохі былі неаднолькавымі і залежалі ад культурна-гістарычных і рэлігійных фактараў. Напрыклад, у эпоху Антычнасці праца, найперш вытворчая, не карысталася пашанай і павагай, за выключэннем працы земляробаў. Праца лічылася лёсам нявольнікаў, нявартай вольнага чалавека. Творчыя здольнасці вольны чалавек рэалізоўваў у дзяржаўнай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

У адпаведнасці з антычнымі ідэаламі памяркоўнасці і гармоніі, багацце разглядаецца не як самамэта, а як сродак для вядзення жыцця, годнага вольнага грамадзяніна. Багацце дзеля яго самога асуджалася. Напрыклад, Арыстоцель адрозніваў два процілеглыя тыпы гаспадарання: эканоміку і хрэматыстыку. Эканоміка – правільны тып гаспадарання, які адпавядае рэчаіснасці і мае на мэце задаволіць разумныя патрабаванні «дома» або «сям'і». Хрэматыстыка – асуджаемы тып гаспадарання, не адпавядаючы універсальным касмічным законам, які мае на мэце нажыву і ўзбагачэнне, неабмежаванае разумнымі патрабаваннямі імкненне да збірання. Арыстоцель атаясамліваў уласнасць з маёмасцю, тлумачыў уласнасць праз паняцці карыстання і ўладання. Карыстаннем ён лічыў марнаванне маёмасці, а ўладаннем – яе набыццё і захаванне. Пазней рымскія юрысты распрацавалі класічнае тлумачэнне ўласнасці як уладання, карыстання, распараджэння.

З надыходам хрысціянскай эры Айцы Царквы заўсёды падкрэслівалі этычнае значэнне працы. Клімент Александрыйскі называў працу «школай грамадскай справядлівасці» [5]. Васіль Вялікі сцвярджаў, што «намер набожнасці не павінен служыць падставай лянoты і багацця ад працы, а падахвочваннем да яшчэ большай працы» [5]. Ян Златавуст заклікаў лічыць ганьбой не працу, а бяздзейнасць. Шмат у чым у якасці ўзору для пераймання з'яўлялася гаспадарчая дзейнасць кляштараў.

Выкладзенае аспрэчвае меркаванне аб тым, што хрысціянства разглядае працу як праклён або ў лепшым выпадку як пакаранне за грэх. Падобнае тлумачэнне працы ўжываецца толькі ў дачыненні да сярэднявечнага заходняга хрысціянства (каталіцызму). У адрозненне ад праваслаўя, для каталіцызму характэрны судова-юрыдычны падыход да многіх рэлігійных тэм (злачынства, знявага, пакаранне, плата, залік, выкуп, задавальненне і г. д.).

Архірэйскі сабор Рускай Праваслаўнай Царквы ў жніўні 2000 года прыняў «Асновы сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы», дзе былі сфармуляваны базавыя палажэнні вучэння па пытаннях царкоўна-дзяржаўных адносін і па шэрагу сучасных праблем, маючых вялікае значэннне для грамадства.

Праваслаўная традыцыя, «якая настойвае на прыярытэце духоўных каштоўнасцей у жыцці людзей, не ігнаруе каштоўнасці матэрыяльныя, бо прадугледжвае адказны ўдзел чалавека ва ўдасканальванні Божага тварэння» [6, с. 21]. У «Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы» адзначаецца тое, што «з хрысціянскага пункта гледжання праца сама па сабе не з'яўляецца безумоўнай каштоўнасцю. Яна становіцца благаславеннай, калі ўяўляе сабой супрацоўніцтва з Госпадам і спрыяе выкананню Яго задумы пра свет і чалавека» [5]. Чалавек быў створаны Богам і яму ў абавязак была дадзена праца. Аб гэтым сведчаць наступныя месцы з Біб-

ліі: «І ўзяў Гасподзь Бог чалавека, і пасяліў яго ў саду Эдэмскім, каб апрацоўваць і захоўваць яго» (Быц.2:5), «Хто краў, надалей не крадзі, а лепш працуй, робячы сваімі рукамі карыснае, каб было з чаго ўдзяліць тым, хто жыве ў нястачы» (Еф. 4:28). Праца разглядаецца як крытэрый вымярэння адпаведнасці і падпарадкавання дзейнасці чалавека рэлігійным устаноўкам. Любая праца для чалавека ў радасць. У Бібліі існуе шмат сведчанняў аб станоўчых адносінах да працы. Праца ўяўляецца як спосаб і ўмова існавання чалавека ў свеце.

Прадпрымальніцтва як разнастайнасць гаспадарчай дзейнасці не павінна выклікаць непрыняцця. Разам з тым, характар працы прадпрымальнікаў часта выклікае незадаволенасць з боку акружаючых. Але ў Бібліі мы можам знайсці пацвярджэнне існавання аналагаў сучаснай прадпрымальніцкай дзейнасці (напрыклад, гандлю) у старажытныя часы: «Лідзія, якая шануе Бога, гандлявала баграніцай» (Дзеян.16:14), «Вы тыя, хто гаворыць: сёння альбо заўтра накіруемся ў гэты горад і будзем гандляваць і атрымліваць прыбытак» (Іак. 4:13). Вытворчасць тавараў і гандаль не асуджаюцца праваслаўнай царквой. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на матывацыю працы. Царкоўныя дзеячы вызначаюць толькі два маральныя заахвочванні да працы: праца дзеля задавальнення сваёй патрэбы ў ежы і праца на карысць іншых людзей. Праца з эгаістычных падахвочванняў не вітаецца. Аднак існуюць сферы эканамічнай дзейнасці, якія не ўзгадняюцца з хрысціянскімі маральнымі нормамі, напрыклад, бізнес, звязаны з азартнымі гульнямі. Вядома, што праца ў такіх галінах асуджаецца царквой. Вынікі працы павінны быць адэкватна ацэнены і ўзнагароджаны. Гэты тэзіс вызначае ўзаемаадносіны працаўнікоў і наймальнікаў. «Не крыўдзі наймальніка… У той жа дзень аддай яму плату яго… каб ён не ўзводзіў паклёп на цябе Госпаду, і не было на табе граху» [Втор. 24:14–15]. Варта таксама адзначыць, што прадукты працы павінны быць размеркаваныя ў адпаведнасці з хрысціянскім разуменнем, г. зн. на карысць і тых грамадзян, якія не могуць забяспечыць сябе матэрыяльна, што выяўляецца перш за ўсё ў дабрачыннасці. Дабрачыннасць – бескарыслівая дзейнасць, накіраваная на дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу, і заснаваная на рэлігійна-этычных нормах праваслаўя. У заходнім варыянце існуе спонсарства. Знешне дабрачыннасць і спонсарства могуць разглядацца як з'явы аднаго парадку. Аднак за знешне аднолькавымі дзеяннямі хаваецца розная па сваёй сутнасці дзейнасць. Асноўнае адрозненне заключаецца ў матывацыі: дабрачыннасць – маральны абавязак кожнага паспяховага прамыслоўца або бізнесмена. Спонсарства – заключэнне здзелкі між бізнесменам і другім бокам, якая прадугледжвае атрыманне выгады для абодвух удзельнікаў. У другім выпадку на першым месцы знаходзяцца не маральна-этычныя прынцыпы, а звычайнае імкненне атрымаць дадатковы прыбытак, выкарыстаўшы схаваную рэкламу.

Наяўнасць розных форм уласнасці з'яўляецца неад'емнай умовай прадпрымальніцкай дзейнасці. Праваслаўе ўсведамляе правы чалавека на ўласнасць. «Царква ўсведамляе існаванне разнастайных форм уласнасці. Дзяржаўная, карпаратыўная, прыватная і змяшаная формы ўласнасці ў розных краінах атрымалі рознае ўкараненне. Пры кожнай з іх магчымы як грахоўныя з'явы – крадзеж, нажыванне, несправядлівае размеркаванне выніку працы, так і дастойнае, маральна апраўданае выкарыстанне матэрыяльных даброт» [5]. Валоданне ўласнасцю ў праваслаўі не разглядаецца як сведчанне маральнага аблічча чалавека альбо яго богаўгоднасці. Валодаючы маёмасцю, варта памятаць аб памяркоўнасці і не захапляцца матэрыяльнымі выгадамі. Небяспечнасць ад валодання ўласнасцю можа выяўляцца ў яе няправедным выкарыстанні, а таксама ў імкненні памножыць яе за лік іншых, але, ідучы ўслед за старазапаветным наказам «не жадай хаты блізкага твайго… ні поля яго, [ні раба яго], ні рабыні яго, ні вала яго, [ніякай жывёліны яго], нічога, што ў блізкага твайго» [Зыход, 20:17], можна пазбегнуць спакусаў.

Вынікам паспяховай прадпрымальніцкай дзейнасці з'яўляюцца высокі ўзровень прыбыткаў і, як вынік, паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту прадпрымальніка. Прынята думаць, што праваслаўе асуджае багацце. Аднак у Святым Пісанні не змяшчаецца ганьбавання багацця як такога. Багацце не з'яўляецца мэтай, а выступае як праява Божага дабрадзейства. Але і бедната таксама можа быць сведчаннем боскай ласкі. Прывядзем выказванне аднаго з буйнейшых прамыслоўцаў пачатку ХХ стагоддзя В. П. Рабушынскага: «Многіх з нас калісьці Гасподзь благаславіў багаццем, а зараз беднатой або нават галечай. Гэта благаславенне, думаецца, яшчэ вышэй» [7, с. 8]. Гэта выказванне ілюструе дваістасць багацця: яно з'яўляецца божым дарам, але накладвае велі-

зарную адказнасць на ўладальніка, які аказваецца перад найскладанай задачай. Сутнасць яе ў справядлівым выкарыстанні сродкаў. Для сапраўды маральнага чалавека гэта не будзе цяжкай ношай, паколькі ён зможа распарадзіцца багаццем на аснове маральна-этычных нормаў. Для чалавека, які мае сумненні, багацце можа стаць сур'ёзным выпрабаваннем.

Такім чынам, праваслаўная царква не адмаўляе прадпрымальніцтва, але з патрабавальнасцю адносіцца да яго матываў і форм.

Сярод сучасных беларускіх і расійскіх прадпрымальнікаў ёсць шчыра веруючыя, гарачыя прыхільнікі праваслаўя. Яны будуюць свой бізнес згодна з асноўнымі прынцыпамі праваслаўнага веравучэння, спрабуючы знайсці шляхі аб'яднання веры з практычнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. Сведчаннем гэтага выступаюць стварэнне і дзейнасць у Расіі такіх грамадскіх аб'яднанняў, як Асацыяцыя хрысціян-прадпрымальнікаў, Клуб праваслаўных прадпрымальнікаў. Апошні налічвае дзесяцігадовую гісторыю. Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II адзначае актыўны ўдзел членаў Клуба праваслаўных прадпрымальнікаў у розных дабрачынных праграмах, у сацыяльна-значных праектах, якія маюць вялікае агульнацаркоўнае і агульнадзяржаўнае значэнне [8].

У Беларусі актыўна дзейнічае сацыяльная ініцыятыва «Праваслаўныя прадпрымальнікі Беларусі». Выкарыстоўваючы рэсурсы Internet, праваслаўныя прадпрымальнікі заснавалі ўласны сайт, які з'яўляецца вельмі папулярным. Тут можна знайсці аднадумцаў, абмеркаваць пытанні і праблемы, якія ўзнікаюць у працэсе прадпрымальніцкай дзейнасці. На сайце арганізавана двухбаковая сувязь з царкоўным дзеячам, які аказвае неабходную духоўную дапамогу.

Разам з існаваннем фармальных інстытутаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія ўключаюць правы ўласнасці, правілы карпаратыўнага кіравання і правілы абмену, можна вылучыць і нефармальныя, элементамі якіх з'яўляюцца звычаі дзелавога абароту, давер і дзелавая этыка. Бізнес-этыка выступае як неад'емная частка эканамічнай культуры. Адпаведна, чым вышэй узровень апошняй, тым верагодней выкананне ўдзельнікамі эканамічных адносін асноўных прынцыпаў дзелавой этыкі. Культура прадпрымальніцтва як праява прававых і этычных крытэрыяў уключае наступныя адносіны: з дзяржавай, грамадствам, спажыўцамі, служачымі, партнёрамі, канкурэнтамі і іншымі суб'ектамі гаспадаркі, а таксама выкананне дзеючых прававых актаў, стандартаў, правілаў, норм, якія прама альбо ўскосна ўплываюць на развіццё прадпрымальніцтва.

Адной з умоў легітымнасці прадпрымальніцтва як грамадска неабходнага віду гаспадарчай дзейнасці, на наш погляд, з'яўляецца фарміраванне кодэкса прадпрымальніцкай этыкі. Важным уяўляецца захоўванне прадпрымальнікамі агульных этычных норм, якія ўключаюць прафесійную этыку, этычныя кодэксы фірмы, агульнапрынятыя правілы вядзення бізнесу, узровень культуры і выхавання прадпрымальнікаў, ступень іх дамаганняў, выкананне звычаяў і нораваў, якія дзейнічаюць у грамадстве, узровень ведаў, неабходных для ажыццяўлення законнага бізнесу, і інш.

Этычныя нормы ў прадпрымальніцтве прадстаўляюць сабой сукупнасць прыкмет паводзін грамадзян, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць у розных сферах эканомікі, накіраваную на задавальненне патрэб рынку, пэўных спажыўцоў, грамадства і дзяржавы [9, с. 69]. У сферы прадпрымальніцкай дзейнасці павінны дзейнічаць правілы, якія не ўступаюць у жорсткую апазіцыю з маральнымі нормамі і прынцыпамі, прынятымі ў дадзеным грамадстве, а якія базіруюцца на іх. Гэта дазволіць максімальна бязбольна ўкараніць новы феномен у свядомасць грамадскасці.

На наш погляд, у беларускім грамадстве наспела вострая неабходнасць стварэння асобага этычнага кодэкса вядзення бізнесу, зводу правілаў прадпрымальніцкай дзейнасці, які з'яўляўся б часткай новага культурнага стэрэатыпу, які павінен стаць у сённяшніх умовах стрыжнем светапогляду сучаснага беларуса. Пры гэтым варта ўлічваць, што, акрамя фарміравання бізнес-этыкі, неабходна прадумаць шляхі і спосабы яе рэалізацыі ў грамадстве, каб спрыяць працэсу легітымізацыі феномена прадпрымальніцтва.

Асновай для стварэння норм прадпрымальніцкай этыкі могуць стаць праваслаўныя прынцыпы, паколькі, на наш погляд, удзельнікі эканамічных адносін павінны кіравацца ў сваёй дзейнасці тымі ж прынцыпамі, што і ў іншых сферах жыццядзейнасці. Спроба рэплікацыі хрысціянскіх каштоўнасцей павінна прынесці выключна станоўчыя вынікі.

В. Арлоў адзначае, што «важным фактарам уплыву праваслаўя на станаўленне эканамічнага менталітэту з'яўляецца тое, што законы праваслаўя прадпісвалі дапамогу блізкаму і надзейнасць

слова... Праваслаўе выхоўвае ў людзях глыбінную прыхільнасць да духоўных каштоўнасцей, сярод якіх вылучалася пакора» [10, с. 201]. Праваслаўная культура дапамагае супрацьстаяць крадзяжу, падману, зайздрасці. Праваслаўе стымулюе людзей да пастаяннага развіцця, у тым ліку і прафесійнага, таму што вера патрабуе ад чалавека пастаяннага ўдасканальвання. Акрамя вышэйадзначанага, В. Арлоў мяркуе, што «чалавек, які шчыра лічыць сябе праваслаўным, ніколі не падтрымае ніякага варыянта капіталізму, пры якім абагачэнне – вышэйшая мэта зямнога жыцця (напрыклад, пратэстанцкага заходняга капіталізму), незалежна ад таго, сумленным або несумленным шляхам гэта абагачэнне адбылося» [10, с. 201].

В. Кандалінцаў, аўтар методыкі «Фарміравання праваслаўнай карпаратыўнай культуры на прадпрыемстве», лічыць, што «многія праваслаўныя каштоўнасці арганічна спалучаюцца з тымі задачамі, якія стаяць перад бізнесам» і адзначае тое, што вышэйпамянёная дабрадзейнасць – пакора – дапамагае спраўляцца з цяжкімі абставінамі, якія ўзнікаюць пад час працы, а паслушэнства дазваляе вырашаць пытанні, звязаныя з разыходжаннем інтарэсаў супрацоўнікаў і асобных падраздзяленняў кампаніі [11].

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, варта адзначыць, што існуюць розныя пункты погляду з нагоды магчымасці і правамернасці выкарыстання праваслаўных традыцый у прадпрымальніцтве. На наш погляд, у Беларусі рыначныя адносіны маюць спецыфічныя асаблівасці, і варыянт заходняга капіталізму, заснаваны на пратэстанцкіх каштоўнасцях, малапрымальны на беларускай зямлі. Зыходзячы з гэтага, пры фарміраванні эканамічнай канцэпцыі развіцця грамадства магчыма выкарыстанне ментальных традыцый беларускага народа, заснаваных на хрысціянскіх праваслаўных каштоўнасцях.

## Літаратура


1. Зомбарт, В. Буржуа: Этюды по истории духовного развития современного экономического человека / В. Зомбарт. – Пер. с нем.; изд. подгот. Ю. Н. Давыдов, В. В. Сапов. – М.: Наука, 1994.

2. Вебер, М. Избранные произведения / М. Вебер. – М. Пер. с нем./Сост., общ. ред. и послесл. Ю. Н. Давыдова; Предисловие П. П. Гайденко. – М.: Прогресс, 1990. (Социологическая мысль Запада). – С. 44–271.

3. Троицкий, Е. С. Историко-методологические аспекты экономического развития по русскому пути // Русский путь в развитии экономики. Сб. ст. / Под ред. Е. С. Троицкого. – М.: 1993.

4. Платонов, О. 1000 лет русского предпринимательства. Из истории купеческих родов /О. Платонов. – М: Современник, 1995.

5. Библиотека православного христианина «Благовещение» [Электронный ресурс] / Основы социальной концепции Русской Православной Церкви. – 2000. – Режим доступа: http:// www. wco. ru/biblio/books/koncepl/. – Дата доступа: 27.11.2006.

6. Россия и православный мир \\ Предпринимательство. – 2004. – № 12.

7. Социально-гуманитарное и политическое образование [Электронный ресурс] Богданов, В. П. Московское купечество XIX – начала XX в. глазами его представителей / Прохоровские чтения. Материалы научно-практической конференции, посвященной 200-летию Прохоровской мануфактуры. 9-10.12.1999 г. – Режим доступа: http:// www.humanities.edu.ru/index.html. – Дата доступа: 28.11.2006.

8. Православие.ru [Электронный ресурс] / Состоялось ежегодное заседание Клуба православных предпринимателей. – Режим доступа: http://www.pravoslavie.ru/news/041229132139. – Дата доступа: 27.11.2006.

9. Шевченко, И. К. Организация предпринимательской деятельности. Учебное пособие / И. К. Шевченко. – Таганрог: Изд-во ТРТУ, 2004.

10. Орлов, В. И. Философия бизнеса в обществах переходного типа: монография \ В. И. Орлов. – Минск: Экономпресс, 2004.

11. Свой бизнес. [Электронный ресурс] \ «Бизнес, построенный на Вере». – Режим доступа: http://www.mybiz.ru/post/12059/default.asp. – Дата доступа: 30.11.2006.